# МАРГАРЫТА ЛАТЫШКЕВІЧ



## Душапрыказчык

Апавяданне

Латышкевіч Маргарыта нарадзілася 19 студзеня 1989 года ў Брэсце. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, працягвала навучанне ў магістратуры і аспірантуры. Працуе ў галіне наратыву камп'ютарных гульняў, жыве ў горадзе Нові Сад (Сербія). Піша вершы і прозу. Актыўна развіваецца ў жанры міфалагічнага фэнтэзі. Аўтар кніг вершаў «Пульс навальніц», «Там, дзе сэрца», кніг прозы «Яблыкі», «Наш дом», «Уласны крыж», «Лисиный перстенёк», «Муры, Том і дырыжаблік», «Вершнікі на дарозе». Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі.

*Параўнальна недалёкая будучыня. Супрацоўнік спецыяльнай службы аднаго з міністэрстваў выпраўляецца на выклік з прычыны смерці кліента (для стандартных працэдур). А далей усё ідзе не па плане.*

У садзе буялі касачы.

Сузор'ямі ўсіх адценняў сіняга рассыпаліся над клумбамі, мерна пагойдваліся пад лагодным ветрам. Цёмнае кустоўе бэзу абступала стары дом — двухпавярховае лецішча са светлай верандай і драўляным ганкам.

Пазвоньвалі пчолы.

Зініч крочыў па садовай сцежцы ад рыплівай брамкі, наступаючы на лусты сонечнага святла, рассыпаныя па жвіры. Ідучы, думаў, як, напэўна, хараша жыць у такім доме, і каб вакол быў сад, а за садам — рака, і каб увечары за сталом пад лямпаю збіраліся за гарбатаю ўсе знаёмыя і любімыя.

Асляпляльна ўспыхвала шкло веранды, а з-за прыадчыненых дзвярэй на ганак выдзімала паўпразрыстую фіранку, падобную да слюдзістага цела медузы.

Сад і стары, можа, канца мінулага стагоддзя, дом так і патыхалі спакоем чэрвеньскага поўдня, млявага, духмянага і павольнага, як кропля смалы. У гэтым спакоі, як мушкі, вязлі людзі — такія ж прыхадні, як Зініч, усе збольшага ў форме паліцыі. Двое медыкаў пранеслі паўз Зініча насілкі з чорным пластыкавым мяшком. Яшчэ адзін медык, паўзнаёмы барадач, суха кіўнуў, працягнуўшы для вітання доўгую далонь.

Зініч падняўся на ганак, адчуваючы, як парыпвае і прагінаецца пад ягонымі крокамі натомленае дрэва. Крануўся разнога слупка, з якога патроху аблазіла фарба, успомніў — праблескам — ганак у вёсцы, якой болей няма, і закалочаныя вокны, і запушчаны сад.

— Спёка,— аддуваючыся, дабрадушна сказаў Зінічу адзін з патрульных,

якія, зняўшы шлемы, адпачывалі на ніжняй прыступцы ганка. Зініч толькі павёў плячыма пад строгім пінжаком і, паблытаўшыся ў фіранцы, увайшоў.

Унутры было ціха і змрочна. Дзесьці цурчэў гадзіннік і хадзілі, перагаворваючыся, людзі. З вітальні з-пад аркі адкрывалася зала — невялікая, аддзеленая ад сонечнага дня цяжкімі гардзінамі, затопленая душным паўзмрокам. Там бачныя былі ўспышкі: мусіць, штатны фатограф заканчваў сваю справу, схопліваў штосьці важнае для пратакола.

Пад нагамі храбуснула бітае шкло. Дзверы ў кухню, некалі зашклёныя, зараз драпежна шчэрыліся аскепкамі і пагойдваліся на адной завесе. У бітым шкле цьмяна адсвечваў метал на смарт-наручы. Такой самай, як у Зініча на левым запясці, адно раструшчанай, можа, пад ботам аднаго з патрульных. А можа, падчас сумятні, што тут адбылася.

Зініч нахінуўся, механічна падняў мёртвы прыбор і ўзважыў на далоні.

— Лухта,— працадзіў Зініч услых. Шчоўкнуў гузікам прыбора на левым запясці, выклікаючы галаграфічны дысплэй. Нервова торгаючы вуглом вуснаў, яшчэ раз прагартаў старонкі асабістай справы кліента. Па Зінічавым бледным твары, па сценах, абклееных старасвецкімі шпалерамі ў кветачкі, плылі водбліскі ад слоў і выяў.

Ніна Коваль — круглае аблічча, круглыя вочы за круглымі акулярамі. Вусны строга падціснутыя: фота з афіцыйнага працоўнага профілю, фота слыннага навукоўца. А можа, ты і ў жыцці была такой вось строгай, халоднай, закрытай, а, Ніна Коваль? Асабісты нумар, біялагічныя маркеры. Коды ідэнтыфікацыі, эмпат-пароль. Усё на месцы. Пяцьдзясят тры гады. З іх апошнія два жыве тут — пасля смерці мужа.

— ...жыла тут,— педантычна выправіў Зініч напаўголасу, зноў таргануўшы вуглом вуснаў. Прабег дасье вачыма, таропка выхопліваючы асобныя словы. Так, муж, аўтакатастрофа, так, так. Сын... колькі, 18? 19 гадоў? Так. Строгая Ніна Коваль зноў пытальна глядзела на Зініча з-за круглых акуляраў.

Пад сямейнымі фота падпіраў сцяну яшчэ адзін прадстаўнік патрульнай брыгады. Пабачыўшы Зініча, нахмурыўся. Пасля згледзеў сярэбраны жэтон на лацкане строгага пінжака — і заміргаў, міжволі выпрастаўся. Нават раскрыў быў рот, каб загаварыць, але Зініч прыклаў палец да вуснаў і пакруціў галавой. Тады патрульны проста паважліва адступіў, кіўком паказаўшы на дзверы ў дальнім канцы калідора.

— Замкнулі, значыць? — Зініч прыўзняў брыво. Патрульны паціснуў плячыма:

— Сам.

Пакой аказаўся самы звычайны. Дакладней, досыць звычайны для юнака такога ўзросту: колькі дыпломаў і медалёў на сценах, плакаты з музычнымі гуртамі — ці то адным, ці то рознымі, але дужа падобнымі. Грыф запыленай гітары сумна глядзеў са старасвецкай шафы, на паліцах пярэсціла вокладкамі колькі рарытэтных папяровых кніг і фігурак супергерояў. Тут жа ледзь свяціўся экран электроннай кніжкі.

Гаспадар пакоя сядзеў спінаю да дзвярэй, скурчыўшыся ля стала. Камп'ютарная панэль, праўда, заставалася цёмнай — падобна, была ўвогуле не падключаная. Акно пакінулі прыадчыненым, вецер мяккаю лапай кратаў шапяткія лісткі паперы на падаконні. На паперы краем вока Зініч заўважыў малюнкі алоўкам і акварэллю — твары, і дрэвы, і нейкія нябачаныя гарады.

Зініч, гледзячы на светлую віхрастую макаўку, амаль бязгучна прычыніў за сабою дзверы. Гаспадар пачуў, сярдзіта бліснуў на нязванага госця сінімі вачыма. Амаль адразу ж адвярнуўся, але Зініч паспеў заўважыць лейкапластыр на рассечаным брыве і паморшчыўся: да яго, Зініча, з'яўлення тут усё паспела зайсці задужа далёка.

Некаторыя рэчы, паводле Зінічава вопыту, абцяжарваюць справу. А справа сама па сабе нялёгкая.

— Вы таксама медык? — глуха спытаў гаспадар пакоя. Бачна было, як пад белаю цішоткай напружылася яго спіна.— Або...

Зініч з прафесійнай цярплівасцю вытрымаў паўзу, каб гэтае крохкае, як

шкло, і небяспечнае «або» трохі ачэзла, астыла, і спакойна адказаў:

— Хутчэй, душапрыказчык.

Той зноў азірнуўся — дзевятнаццацігадовы хлопчык з яснымі сінімі вачыма. Уважліва вывучыў змрочную Зінічаву постаць, недаверліва ўтаропіўся ў сярэбраны блік на лацкане. Нахмурыўся:

— Н-не разумею.

Зініч ухмыльнуўся. Патлумачыў паблажліва: шаноўная Ніна Сяргееўна Коваль — наш даўні кліент. Нават болей: яго, Зініча, кліент. І, улічваючы абставіны, умяшанне збоку досыць своечасовае.

— То вы... дапаможаце? — насцярожана пацікавіўся хлопчык. Падняўся з крэсла, няўпэўнена пераступаючы з нагі на нагу, разгублены і напяты.

«А вось гэта кепска,— падумаў Зініч, гледзячы на збітыя ў кроў касцяшкі суразмоўцы.— Болей разбітага шкла ды выламаных дзвярэй нам не трэба. І праблем з патрульнымі не трэба таксама. Ніякіх эксцэсаў».

На крайні выпадак у кішэні ляжала запаветная ампула, але да падобных мер звяртацца не хацелася. Прынамсі, пакуль. Ампула — апошні довад, туз у рукаве.

— Канечне, дапамагу,— супакойліва працягваў Зініч пад трывожным позіркам сініх вачэй.— Мая задача найперш — выканаць дамову з кліентам.

— З ма... з мамай, значыць? — хлопчык перарывіста выдыхнуў, і нешта ў гэтым выдыху было такое, што Зініч рыпнуў зубамі і асцярожна адступіў, звыкла намацваючы ампулу. «Нервуюся»,— падумаў тут жа, калі стала ясна, што асцярога была залішняя. Але асцярога ніколі не бывае залішняй, асабліва ў такіх справах. Зініч з непрыемнай выразнасцю прыгадаў свае шрамы: два на правым плячы і адзін цераз грудзі. Бяздумна правёў пальцамі па грудзях, там, дзе мусіў пралягаць рваны шоў — напамін пра адну колішнюю неасцярожнасць.

Зрэшты, нашыя шрамы робяць нас — намі.

— Вас як... завуць?

Зініч варухнуў бровамі і назваўся, усміхнуўшыся мяккай прафесійнай усмешкай. Не здымаючы ўсмешкі, звыклым рухам прыўзняў манжэту белай кашулі, трохі агаляючы смарт-наруч, тая па-змоўніцку падміргнула блакітнаю кропкай, і Зініч, нарэшце, з палёгкаю перавёў дыханне.

Блакіт быў выратаваннем.

— Я — Адам,— прагаварыў хлопчык. Ускудлачыў адной рукой светлыя валасы, паглядзеў спадылба.— Слухайце... мне ўжо можна... з'ехаць? Я не магу... не цяпер. Болей не магу тут.

— З'ехаць? — Зініч, трохі падбадзёраны сігналам наручы, дазволіў сабе ўслых здзівіцца.— Куды з'ехаць, калі не сакрэт?

Адам не адказаў, але досыць красамоўна слізгануў позіркам убок. Зініч па нітачцы гэтага позірку прайшоў, ступаючы па касматым дыванку. Узяў двума пальцамі са стала льсняную медыярамку. Тая адгукнулася на дотык, выдала на люстраным экране відэа: хлопец і дзяўчына абдымаюцца, смяюцца, цалуюцца. У хлопца быў Адамаў твар, хай і з іншаю прычоскай. Дзяўчо, дзесь аднагодка, трэсла стрыжанымі цёмнымі кудзерамі — і на белай шчацэ паказвалася цёмная кропелька радзімкі.

«Міленькая,— ацаніў Зініч.— Не прыгажуня, але твар запамінаецца. Жывы твар».

— Калі бацька загінуў,— глуха загаварыў тым часам Адам,— маці... моцна здала. Захацела пераехаць сюды з горада. Хварэла, ну і... я, канечне, дапамагаў, нават вучобу кінуў, каб з ёй... усё на свеце кінуў, карацей. І два гады — вось так. Сам-насам. Без сеціва, без званкоў. Толькі ўдваіх. Ну, у краму часам выйдзеш, на рынак. Доктара, можа, выклічаш.

— А ты, значыць... добры сын,— змушана сказаў Зініч, зноў зірнуўшы на мёртвую камп'ютарную панэль. Адам сутаргавата паціснуў плячыма.

— Не... не вельмі,— мовіў ціха.— Не тое каб мне не хацелася...— пагляд хлопца зноў упаў на рамку.— На яе яшчэ находзіла часам. Проста бескантрольнае нешта. Ярасць. Не думайце, што было... лёгка.

У гармідары запісаў, лістоў, паведамленняў двухгадовай даўнасці Зініч крок за крокам вычапіў патрэбнае — быццам клубок разгортваў. Пацягнуліся даты, імёны, словы, словы, словы. Мільганула адно фота, другое, і раптам — дакладна, несумненна яна, тая самая, міленькая, з цёмнымі кудзерамі ды радзімкай. Гэты твар ні з якім іншым не зблытаеш.

Профіль у сацсетках аказаўся даўно выдалены, але цяпер Зініч хаця б ведаў імя. У транспарце ад Дзіны — такім самым службовым электрамабілі, як і той, што ляжаў на тратуары перакуленым — Зініч, дазволіўшы сабе разваліцца на заднім сядзенні, прабіў знойдзенае імя па міністэрскай базе. Горад-спутнік патроху закончыўся, мільганулі палі, прарэджаныя зялёныя зоны — і, вынырнуўшы з-за далягляду, вырас горад: спачатку пузатыя вежы ТЭЦ, шкляныя, у колер хмурнага неба, хмарачосы на ўскраінах, насатыя пад'ёмныя краны на новых будоўлях.

У люстэрка задняга віду бачна было, як кіроўца, немаладая жанчына ў форменным камбінезоне, з цікаўнасцю косіцца на Зініча. Тамара? Ці ўсё-такі Галіна? Здаецца, яны раз ці два сутыкаліся ў Цэнтры. Кіроўца трасянула стрыжанымі сінімі валасамі, трохі пакорпаўшыся ў бардачку, шпульнула назад пакунак сурвэтак. Зініч спаймаў яго, растрыбушыў вольнаю рукой, ацёр твар.

— Дакладна не ў бальнічку?

— Пакуль не,— азваўся Зініч. І ўслых прачытаў са старонкі пашукавіка адрас. Кіроўца коратка кіўнула, а Зініч, адключыўшы дысплэй, адкінуўся на спінку сядзення і апусціў павекі. Млосць накатвала хвалямі, варочалася ўнутры, падавалася сіняю кветкай, што распускае адзін за адным заточаныя, як лязо, пялёсткі. Пакутліва ныла патыліца, і Зініч, не размыкаючы павек, крануўся яе пальцамі. Пад валасамі, пад скурай, падалося, намацаў нейкі няўцямны і вусцішны вугал, і ад дотыку ўваччу пырснула рэзкім асляпляльным блакітам. Зініч задыхнуўся, адхапіў руку.

— ...прыехалі, кажу.

Зініч часта заміргаў і за мітуснёй блакітных кропак пабачыў, што аўто стаіць, прыпаркаванае ля сціплага шматпавярховіка, што кіроўца павярнулася да яго і пытальна глядзіць, аддзьмухваючы з твару сінія пасмы.

— Мо ўсё-такі ў бальнічку?..

— Рана,— адрэзаў Зініч. Выбраўся з салона на асфальт, звузіўшы вочы, вывучыў усе дванаццаць паверхаў. Павісквалі дзеці ля горкі ды гушкалак, а над паркоўкай залівалася патрывожаная сігналізацыя на нечым аўто.

«Што тут зрабіць,— думаў Зініч, чакаючы ліфта патрэбная кватэра месцілася на сёмым паверсе.— Дзіна казала ясна: Брагінскі дае свой дазвол. Значыць, баста. Крайняя мера. Правалены эксперымент. Пытанні статыстыкі — яны, часцей за ўсё, рытарычныя».

Зініч уздыхнуў і зноў міжвольна прыгадаў вычварныя лініі шрамаў на сваім целе. Закалола, заныла ў патыліцы. Ампула ў кішэні ацяжэла, наліваючыся свінцовым цяжарам.

Каробачка ліфта паўзла ўверх павольна — цёмная, дрогкая, з дошкаю аб'яў на шэрай сцяне. Зініч аслабіў вузел сіняга форменнага гальштука, адцягнуў каўнер кашулі пальцам: у цесных замкнёных памяшканнях заўжды пачуваў сябе няўтульна. Асабліва пасля таго апошняга выпадку пяць год таму, калі апынуўся пад завалам у Гародні. Там, здаецца, таксама быў вось такі яснавокі хлопчык. У выніку атрымалася тое, што атрымалася, і ад гарадскога замка, прынады для турыстаў, мала што засталося. Ад таго гарадзенскага кліента, зрэшты, таксама. А доктар Брагінскі казаў ім: «Рана».

«Можа,— злосна думаў Зініч,— можа, і тут было рана. Але тут іншае. Не забаўка для турыстаў ды паказушніцтва для бюракратаў, а сацыяльны праект. Рэабілітацыя, так яе, карысных членаў грамадства. Добрыя намеры, чыстай вады гуманізм, маць яго. Калі не на гэты ваш смярдзючы гуманізм скарыстоўваць дзяржаўныя фонды, дык на што ж яшчэ? Брагінскі на раз-два давёў гэта ўсім камісіям ды інвестарам, усім скептыкам — пасля той гарадзенскай катастрофы. Брагінскі ўмее гаварыць, дарма што сам карузлік з сарамлівым зачосам цераз ружовую лысінку.

# КАЦЯРЫНА НАЗАРАВА



## Золата бабы Луцэйкі

Сямейнае паданне

Назарава Кацярына нарадзілася 30 чэрвеня 1999 года ў вёсцы Краснае Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Друкавалася ў газетах «Звязда», «ЛіМ», часопісе «Маладосць», у зборніку маладых празаікаў «Цень зоркі». Лаўрэат Міжнароднага літаратурнага конкурсу «Першацвет».

Ухаце было сцюдзёна. Сонца прыходзіла кожную раніцу, надвор'ем кіравала бабіна лета. З поўначы дзьмуў сівер, таму па апусцелых гародах лётала гусінае пер'е, лісце ды смецце.

Бабка Луцэйка памірала. Вакол яе ложка, усцеленага падушкамі ў крухмаленых навалачках, пырхалі нявесткі, пляменніцы, унукі. На выхадных хату напаўняў водар бліноў і вантрабянкі, кухня ад пару прэла і тым грэлася. На кухні жанчыны шапталіся пра золата, якое старая недзе схавала. Луцэйка — бабка-загадка, з маленькімі, вузенькімі вочкамі і падціснутымі паўмесяцам вуснамі. Апошнія дні яна моўчкі назірала за роднымі, мала ела і многа спала, чым крыху напружвала сваіх нашчадкаў.

Луцэйка правяла доўгае жыццё, за якое з Юзікам паспела нарадзіць восем дзетак. Рабіла ў калгасе, жыла працай, трымала дзвюх кароў і каня. Была яна дужа набожная: за стол з малітвай, ад стала з малітвай. І быў у яе абавязак перад Богам: ісці ў Вільню сустракаць Вялікдзень. Шлях няпросты, ад Вілейкі да Вільні больш за сто кіламетраў. Выходзіла яна дзесьці за два тыдні да свята і праз столькі ж вярталася дамоў. Пашэнціць, калі на папутны воз падсядзе, але ў асноўным пешшу дабіралася, начуючы ў добрых людзей,— такі яе асабісты подзвіг. Вільня была цэнтрам культуры і гандлю, славілася посудам, тканінамі і ўжо асабліва — добрымі каўбасамі. Сустрэўшы свята ў храме, Луцэйка хадзіла па гандлёвых крамках і вярталася дадому з гасцінцамі.

Луцэйчыны дзеці выраслі і разляцеліся шукаць свой вырай. З'ехалі за мяжу, рассяліліся па розных кутках свету. Назад у Вілейку яны ўжо і не вярталіся, ветліва адсылаючы святочныя паштоўкі на Новы год і Каляды. Толькі меншая дачка Геня засталася жыць у вёсцы, даглядала маму і гаспадарку, тут жа і сваю сям'ю стварыла.

# МІХАЛ БАРАНОЎСКІ



## Пункцірам

Паэтычныя мініяцюры

Бараноўскі Міхал нарадзіўся 1 снежня 1984 года ў Мінску. Скончыў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка па спецыяльнасці «гісторыя і замежная мова». Аўтар паэтычных зборнікаў «Volumen.1» і «Volumen.2», а таксама шматлікіх навуковых і публіцыстычных публікацый, прысвечаных беларускай літаратуры. Укладальнік кнігі «ЖЗЛБ. Максім Багдановіч». Жыве ў Мінску.

*Усім і кожнаму, хто ўмее здзіўляцца з'яве прыроды, парадаксальнай думцы, цікаваму жыццёваму назіранню, вобразу, выхапленаму ў плыні жыцця і зафіксаванаму парай рысак/сказаў.*

✦

таго сябе
што бачыш унутраным зрокам
так цяжка з людзьмі пазнаёміць

✦

зорная хвароба
паблажліва промні працягвае
сонца якое не грэе

✦

не кранаю балючыя тэмы
баюся
раптам не забаліць

✦

дзе ў маім сэрцы
святла і цемры мяжа
досвітак шэры

✦

ці не заўсёды
ў вымушанай позе
жыццё жывём

✦

куды я іду
заблукаў у тумане
думак трывожных

✦

скрозь цемру і час
свецяць промні месяцовага сонца
на нашыя дзве душы

# ВОЛЬГА ДРУШЧЫЦ



## Ты — недасяжная мяжа

Вершы

Друшчыц Вольга нарадзілася 24 ліпеня 2006 года ў вёсцы Старое Сяло Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Студэнтка першага курса факультэта культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Вершы друкаваліся ў жабінкаўскай раённай газеце «Сельская праўда», брэсцкай абласной газеце «Заря», а таксама ў зборніку Беларускага фонду міру «Дзеці за мір».

✦ ✦ ✦

Калі чэрвеньскім золкім ранкам
Першы промень зямлі крануўся,
Прачынаюцца шапкі-буслянкі
На вясковых слупах Беларусі.

Калі з космасу зняць краіну —
Гарады зіхацяць ліхтарамі,
Ну а вёсак сівых хаціны
Захіляюць буслы крыламі.

І вяртаюцца кожную весну,
І гняздо ім сваё не вузка —
Ім у выраі сэрцу цесна
Без вясковых слупоў беларускіх.

Над Дзвіною і над Палессем
Ты высока лятаеш, бусел,
Там ля Госпада, у паднябессі,
Пamaліся за ўсіх беларусаў.

### На кухні

Мне цікава з табой гаварыць,
Мне цікава цябе проста слухаць.
Нашы гутаркі б узнавіць
На маленькай утульнай кухні.

Каб сядзелі адно ўдваіх
І фіранку пахістваў вецер,
Мы з табой па глытках малых
Аксамітны цадзілі б вечар.

Не ўлучаючы лямпу зусім —
Мне б святла тваіх зрэнак хапала,—
Сакатаў бы ўсё аб сваім,
А я ў словах тваіх патанала...

Фота з архіва В. Друшчыц

КРУГЛЫ СТОЛ

# Штучны інтэлект VS творца: прыгажосць у недасканаласці



Мая Пракаповіч, мастачка, ілюстратарка, дызайнерка

*У апошні час свет змяняецца з няўяўнай хуткасцю. Людзі хочуць паспець паспрабаваць новыя тэхналогіі, новыя гаджэты, новыя месцы для падарожжаў, новыя стравы. Навукоўцы прыдумалі тэрмін FOMO (fear of missing out), які азначае дакучлівы страх прапусціць цікавую падзею або перспектыўную магчымасць. «Маладосць», нягледзячы на сваю сямідзесяцігадовую гісторыю, таксама баіцца ўпусціць нешта незвычайнае. Але і кідацца ў вір з галавой, не выпрабаваўшы новую тэму, мы не хацелі. Таму дачакаліся моманту, калі штучны інтэлект шчыльна ўвайшоў у наша жыццё: з дапамогай чата GPT пішуць дыпломы, а дзякуючы нейрасеткам ствараюць вокладкі для кніг.*

*Мы пагаварылі з людзьмі творчых прафесій рознага ўзросту, каб даведацца, як штучны інтэлект паўплываў на іх жыццё і ці паўплываў наогул. Дыскусія, якая пачалася ў якасці займальнага інтэлектуальнага практыкавання, ператварылася ў абмеркаванне таго, хто можа лічыцца творцам і ці пераможа створанае чалавекам яго самога.*



Марына Варабей, навуковы супрацоўнік Інстытута літаразнаўства імя Янкі Купалы



Алесь Вешторт, пісьменнік, спецыяліст сферы інфармацыйнай бяспекі



Наталля Шчарбакова, загадчык аддзела кнігавыдання РВУ «Выдавецкі дом «Звязда»



Вячаслаў Паўлавец, мастак, акварэліст



Лідзія Наліўка, літаратурная рэдактарка

*Да ведама*

*Штучны інтэлект — гэта здольнасць лічбавага камп'ютара або кіраванага камп'ютарам робата выконваць задачы, якія лічацца прэрагатывай чалавека. У наш час тэрмін ужываюць у адносінах да праекта развіцця сістэм, надзеленых інтэлектуальнымі працэсамі, якія характэрныя для чалавечага інтэлекту (разважанне, абагульненне, атрыманне вопыту, аналіз).*

*Нейрасетка — матэматычная мадэль, якая працуе па прынцыпах нервовай сістэмы жывых арганізмаў. Яе асноўнае прызначэнне — вырашаць інтэлектуальныя задачы, у якіх няма першапачаткова зададзенага алгарытму дзеянняў і спрагназаванага выніку.*

● ***— Калі вы ўпершыню пачулі пра штучны інтэлект?***

**МАРЫНА ВАРАБЕЙ:**

— Напэўна, пра штучны інтэлект я пачула, калі ўпершыню пачала сутыкацца з выкарыстаннем камп'ютара. Задумвацца пра функцыі праграм, якія могуць выконваць інтэлектуальныя задачы за чалавека, я пачала даволі даўно — пасля школы (гэтаму спрыяла мастацтва, пераважна літаратура і кіно).

**ВЯЧАСЛАЎ ПАЎЛАВЕЦ:**

— Упершыню я даведаўся пра тое, што гэта такое, гады тры таму. Але спачатку ў мяне не было ні даверу, ні цікавасці да штучнага інтэлекту. Толькі праз некаторы час, калі я бачыў, як ён дапамагае людзям з выкананнем базавых задач, захацеў паглыбіцца ў тэму.

**ЛІДЗІЯ НАЛІЎКА:**

— Дастаткова даўно, яшчэ ў дзяцінстве — у творах Рэя Брэдберы і Дугласа Адамса. Але так напраўду не думала, што жыцьму ў час, калі штучны інтэлект перастане быць часткай навукова-фантастычнай літаратуры. Казытлівае адчуванне. Напэўна, таму сама ім не карысталася і не збіраюся, пагатоў мы гаворым living рознымі мовамі, і я кажу не адно ў лінгвістычным аспекце.

● ***— Ці карысталіся вы штучным інтэлектам? Засталіся задаволеныя вынікам?***

**МАЯ ПРАКАПОВІЧ:**

— Нягледзячы на тое, што ўпершыню пачула (а дакладней, пабачыла, бо я візуалка) пра штучны інтэлект даўно і, здаецца, жыву з ім заўсёды, пакуль ніразу ім не скарысталася. Хаця на сваёй карціне «Снежная каралева» я намалявала герaіні большую колькасць пальцаў, чым у людзей. Што гэта, як не жарт у бок штучнага інтэлекту?

*АД РЭДАКЦЫІ:*

*Мая мае на ўвазе асаблівасці нейрасетак, якія сталі папулярнымі мемамі ў інтэрнэце, асабліва ў «Твітэры». Справа ў тым, што на многіх карцінках, згенераваных нейрасеткамі, у людзей часта праблемы з канечнасцямі, асабліва з колькасцю пальцаў.*

**МАРЫНА ВАРАБЕЙ:**

— Мне давялося паспрабаваць карыстацца сучаснымі сістэмамі штучнага інтэлекту. У прыватнасці, правяраць ужыванне моўных канструкцый на замежных мовах праз Bing, а таксама генерыраваць выявы праз мабільныя дадаткі, напрыклад, «DaVinci» ці «Шедеврум». Але я ніколі не рабіла нейкай важнай працы пры дапамозе штучнага інтэлекту ў поўным аб'ёме, часцей карысталася дзеля вырашэння нейкіх неглабальных задач, а часта і для забавы. Напрыклад, з сястрой прасілі штучны інтэлект напісаць песню пра яе ката ў розных кантэкстах — задавалі стыль і тэму — было вельмі весела. Таксама па апісанні стваралі з сябрамі вокладкі музычных кампазіцый для стрымінгавых пляцовак — гэта кароткі шлях, калі неабходна зрабіць ілюстрацыю хутка (але звычайна даводзіцца тлумачыць праграме, «што хацеў сказаць аўтар»).

МАСТАЦТВА

# ЯСЕНІЯ АЛЯКСЕЕВА

## Усе мы там будзем, ці Як смяяцца са смерцю

На чорнай-чорнай вуліцы ў чорным-чорным будынку на чорнай-чорнай сцэне рабілася чорная-чорная магія. І стварылі яе чорныя-чорныя чараўнікі рэжысёр-пастаноўшчык Яўген Карняг, кампазітар Кацярына Аверкава і мастак-пастаноўшчык Таццяна Нерсісян.

### Смерць з прышпілам

Беларускі дзяржаўны тэатр лялек славіцца адкрытымі дарослымі пастаноўкамі, якія шакуюць гледачоў. Але нават тыя, хто хадзіў на папярэднія спектаклі Яўгена Карняга, наўрад ці былі гатовыя спатыкнуцца аб труп, загорнуты ў чорны поліэтылен. Труп валяецца прама на ўваходзе ў глядзельную залу, і пераступіць яго — амаль як прайсці ініцыяцыю. Разумееш, што размова будзе хай і пра смерць, затое з прышпілам. Наш любімы жанр.

Казкі Ханса Крысціяна Андэрсена знаёмыя нам з дзяцінства. Хто не рыдаў над «Дзяўчынкай з запалкамі» і «Гісторыяй адной маці»? Хто не радаваўся, калі перамагала справядлівасць у «Брыдкім качаняці» і «Дзікіх лебедзях»? Хто не звяртаўся за суцяшэннем да дыснееўскай адаптацыі, калі даведваўся, нарэшце, як насамрэч скончылася «Русалачка»?

Гэта наша дзяцінства, наш смутак і наша памяць.

Дзіўна, але ў спектаклі казкі амаль не мяняюцца. Тыя ж рэплікі, што ў арыгінале, тыя ж сэнсавыя акцэнты. Хіба што ў «Дзікіх лебедзях» гэтыя самыя лебедзі паміраюць, але са сцэны радасна тлумачаць, што аўтар проста быў не ў духу. «Снежную каралеву» не дачытаў, вось і сарваўся. А так усё той жа Андэрсен, толькі чамусьці смешны.

### Голыя і (ня)смешныя

Назваць спадара Андэрсена гумарыстам ні ў каго язык не павернецца. А Карняг узяў і ўставіў у дэпрэсіўныя сюжэты прышпілы. Ды такія, што шаноўныя спадарыні на першых радах сарамліва прыкрывалі твары рукамі (не свае, мужавы), а дзяўчынкі на банкетках шапталі: «Афігець, яна амаль голая!» Шакаваць гледача галізной — гэта не тое каб нова і асабліва цікава. У якасці шокавай тэрапіі «засвяціць» цела можа спрацаваць на разрыў. Так што ні ў каго і сумневаў не застанецца ў тым, што спектакль гэты — бомба і экстравагантнасць у адным флаконе. Але калі знаёмы з творчасцю рэжысёра, узнікае пытанне: «А вам гэта навошта?» Няўжо

